УДК 343.36

*І. А. Гааг*
*дацэнт кафедры крымінальнага права і крыміналогіі*
*Юрыдычнага інстытута*
*Кемераўскага дзяржаўнага ўніверсітэта (Расія),*
*кандыдат юрыдычных навук, дацэнт*

# АБ ЗМЕСЦЕ СУБ'ЕКТЫЎНАГА БОКУ ЗЛАЧЫНСТВАЎ СУПРАЦЬ ПРАВАСУДДЗЯ, ШТО ЎЧЫНЯЮЦЦА СЛУЖБОВЫМІ АСОБАМІ, ЯКІЯ ЗАБЯСПЕЧВАЮЦЬ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ПРАВАСУДДЗЯ

У большасці складаў злачынстваў супраць правасуддзя, якія ўчыняюцца службовымі асобамі органаў дазнання, папярэдняга следства і суда, наўмысная форма віны фармулюецца пры дапамозе прыслоўя «заведама», якое з'яўляецца сінонімам да слоў «свядома», «знарок» і такім чынам сведчыць аб тым, што суб'ект усведамляе незаконны характар сваіх дзеянняў.

У сярэдзіне мінулага стагоддзя выказвалася меркаванне, нібыта «заведамасць» уласцівая не толькі для наўмыснай формы віны, але і злачыннай саманадзейнасці [1, с. 8–9]. Гэты падыход справядліва крытыкаваўся ў працах шэрага навукоўцаў [2, с. 201; 3, с. 45].

На першы погляд праз «заведамасць» можа адзначацца толькі наўмысная форма віны, але пры гэтым трэба звяртаць увагу на тое, якой прыкметы складу злачынства яна тычыцца і як сканструяваны адпаведны састаў. У матэрыяльных саставах злачынстваў заведамасць сведчыць аб наяўнасці прамога намеру толькі ў тым выпадку, калі яна характарызуе вынікі, з якімі заканадаўца звязвае крымінальную адказнасць; ва ўсіх іншых выпадках заведамасць можа спалучацца як з прамым, так і з ускосным намерам. Што датычыцца фармальных складаў, выкарыстанне тэрміна «заведама» пры апісанні любой з іх прыкмет непазбежна прыводзіць да высновы, што адпаведнае злачынства можа ўчыняцца толькі з прамым намерам.

У дыспазіцыі арт. 299 Крымінальнага кодэкса (далей — КК) РФ «заведамасць» належыць да прыкмет пацярпелага, але сведчыць аб усведамленні правапарушальнікам незаконнасці сваіх дзеянняў. Жаданне вінаватай асобы скіравана на другое дзеянне (прад'яўленне абвінавачвання), а першае дзеянне (вынясенне

пастановы аб прыцягненні асобы ў якасці абвінавачванага) адыгрывае дапаможную ролю, хоць без яго гэтае другое аказваецца цалкам немагчымым. Правапарушальнік усведамляе (з улікам спецыяльных ведаў) немагчымасць дабіцца прад'яўлення пацярпелыму жаданага для яго абвінавачвання без складання адпаведнага працэсуальнага дакумента, бо яго воля скіравана аднолькава на абодва дзеянні і праяўляецца ў жаданні ўчыніць іх.

У арт. 300 КК РФ, нягледзячы на адсутнасць у ім згадкі пра «заведамасць», інтэлектуальны момант ахапляе ўсведамленне суб'ектам з усёй выразнасцю незаконнага характару сваіх дзеянняў па вызвальненні ад крымінальнай адказнасці. Адсюль вынікае, што і ў гэтым выпадку гаворка вядзецца выключна аб прамым намеры, невыяўленне якога не дазваляе паставіць у віну дадзены састаў злачынства.

Толькі з прамым намерам учыняюцца незаконныя затрыманне, узяцце пад варту і трыманне пад вартай (ч. 1 і 2 арт. 301 КК РФ), аб чым сведчыць вызначэнне ў дыспазіцыях дадзеных нормаў заведама незаконнага характару гэтых дзеянняў. Як і ў вышэй разгледжаных выпадках, тут патрабуецца не проста ўсведамленне злачыннасці сваіх паводзін, але ўсведамленне выразнае, яснае, з усёй пэўнасцю. У той жа час кваліфікуючая прыкмета цяжкіх вынікаў (ч. 3 арт. 301 КК РФ) ператварае састаў з фармальнага ў матэрыяльны, а гэта значыць, што стаўленне вінаватага да самога дзеяння і яго рэзультатаў можа быць неаднародным: воля суб'екта можа быць скіравана выключна да супрацьпраўнага абмежавання асабістай свабоды пацярпелага, тады як цяжкія вынікі гэтага ўчынку могуць толькі свядома дапускацца. Такім чынам, злачынства, прадугледжанае арт. 301 КК РФ, у яго кваліфікаванай разнавіднасці можа ўчыняцца як з прамым, так і з ускосным намерам.

Сапраўды, гэтак жа вырашаецца пытанне аб змесце суб'ектыўнага боку фальсіфікацыі доказаў: асноўныя (фармальныя) саставы гэтага злачынства (ч. 1 і 2 арт. 303 КК РФ) дапускаюць толькі прамы намер, бо фальсіфікацыя — гэта сукупнасць дзеянняў, незаконнасць якіх не можа не ўсведамляцца, прычым усведамленне гэтае мае абсалютна канкрэтны і крайне ясны характар; з іншага боку, кваліфікуючыя «цяжкія вынікі» (ч. 3) могуць быць прычыненыя як з прамым, так і з ускосным намерам. Не застаецца месца ўскоснаму намеру ў саставе фальсіфікацыі вынікаў аператыўна-вышуковай дзейнасці (ч. 4 арт. 303 КК РФ), які не толькі сканструяваны як выключна фармальны, але, апрача таго, змяшчае ў сабе ў якасці абавязковага элемента мэту, якой можа быць

або крымінальнае праследаванне асобы, заведама не звязанай з учыненнем злачынства, або нанясенне ўрону гонару, годнасці і дзелавой рэпутацыі.

Дзеянне, прадугледжанае арт. 302 КК РФ (прымушэнне да дачы паказанняў), гэтаксама належыць да злачынстваў з фармальным саставам. Інтэлектуальны момант віны ахапляе ўсведамленне асобай, па-першае, незаконнасці выкарыстаных спосабаў уздзеяння на іншых удзельнікаў працэсу і, па-другое, таго факту, што ўжыванне любога з гэтых спосабаў прыгнятае волю ахвяры; пры гэтым злачынныя паводзіны скіраваныя на атрыманне паказанняў у іх крымінальна-працэсуальным сэнсе, што характарызуе валявы момант віны — жаданне падпарадкаваць іншую асобу сваёй волі, прымусіць яе даць паказанні. Такім чынам, прымушэнне да дачы паказанняў можа ўчыняцца толькі з прамым намерам. Гэты вывад не закранае згадка ў законе маўклівай згоды следчага або асобы, што праводзіць дазнанне, бо тут вядзецца гаворка пра спосабы, якія ўжываюць іншыя асобы, з чаго непазбежна выцякае, што гэтыя асобы дзейнічаюць выключна з прамым намерам. З прамым намерам дзейнічае ў такой сітуацыі і следчы або асоба, якая праводзіць дазнанне, якая, даючы маўклівую згоду, не проста дапускае незаконныя дзеянні, а менавіта жадае, каб яны былі ўчыненыя, і таму не спыняе відавочна супрацьпраўны і недапушчальны націск на падазронага, абвінавачанага, пацярпелага, сведку, эксперта або спецыяліста. Матыў і мэта з'яўляюцца для дадзенага злачынства факультатыўнымі прыкметамі і могуць брацца пад увагу толькі падчас прызначэння пакарання.

Пры апісанні саставу вынясення заведама неправасуднага прысуду, рашэння або іншага судовага акта (арт. 305 КК РФ) заканадаўца адзначае «заведамую неправасуднасць» як уласцівасць прадмета дадзенага злачынства. Гэта значыць, што суддзя, прымаючы адпаведны працэсуальны акт, не памыляецца, а свядома дзейнічае насуперак палажэнням заканадаўства, гэта значыць дзейнічае з прамым намерам. Што датычыцца «іншых цяжкіх вынікаў» дадзенага дзеяння, якія прадугледжваюцца ў ч. 2 арт. 305 КК РФ, яны (таксама як у вышэйзгаданых выпадках з ч. 3 арт. 301 і ч. 3 арт. 303 КК РФ) могуць прычыняцца не толькі з прамым, але і з ускосным намерам. Неасцярожнасць пры вынясенні заведама неправасуднага судовага акта здаецца нам немагчымай, паколькі суб'ект дадзенага злачынства, які мае спецыяльную адукацыю і пэўны прафесійны досвед, не можа не прадбачыць калі не непазбежнасць, дык рэальную магчымасць цяжкіх наступстваў свайго дзеяння. Канешне, прадбачанне гэткіх наступстваў часцей за ўсё мае неканкрэтызаваны, а іх

дапушчэнне — толькі імавернасны характар, але гэта не значыць, што прадбачанне і дапушчэнне адсутнічаюць.

Падводзячы вынікі, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Прыкметы, якія характарызуюць суб'ектыўны бок, з'яўляюцца не толькі абавязковым элементам саставаў злачынстваў супраць правасуддзя і, такім чынам, неабходнай умовай прыцягнення да крымінальнай адказнасці, але таксама размежавальнымі крытэрамі, па якіх такія злачынствы адрозніваюцца ад сумежных грамадска небяспечных дзеянняў.

2. У суб'ектыўных прыкметах у найбольшай ступені праяўляецца матэрыяльная ўласцівасць злачынстваў супраць правасуддзя — іхняя грамадская небяспечнасць, гэта значыць пагроза інтарэсам не толькі дзяржавы і грамадства ў цэлым, але і асобных грамадзян.

3. Злачынствы, прадугледжаныя ў арт. 299–303, 305 КК РФ, учыняюцца толькі наўмысна, прычым для іх асноўных саставаў характэрны прамы намер, а ў саставах кваліфікаваных магчымы як прамы, так і ўскосны намер. Наўмысны характар злачынстваў супраць правасуддзя часцей за ўсё падкрэсліваецца ў законе пры дапамозе прыкметы заведамасці.

4. Матывы і мэты ў большасці выпадкаў не ўплываюць на кваліфікацыю злачынстваў супраиць правасуддзя і прымаюцца пад увагу толькі падчас прызначэння пакарання (выключэнне — ч. 3 арт. 299, ч. 4 арт. 303 КК РФ).

1. Чельцов М. А. Спорные вопросы учение о преступлении // Социалистическая законность. 1947. № 4. С. 7–9.

2. Трайнин А. Н. Общее учение о составе преступления. М. : Госюриздат, 1957. 364 с.

3. Рарог А. И. Вина в советском уголовном праве ; науч. ред. Б. В. Здравомыслов. Саратов : Изд-во Сарат. ун-та, 1987. 186 с.

УДК 343.214

*Э. В. Густова*
*старший преподаватель кафедры уголовного права*
*Московского университета МВД России им. В. Я. Кикотя,*
*кандидат юридических наук*

## О ПРОБЛЕМАХ ТОЛКОВАНИЯ УГОЛОВНОГО ЗАКОНА

Сегодня юридическая наука во многом оказывается на острие перемен, происходящих в нашем обществе, определяя правовые условия проводимых в стране социальных и экономических ре-